Источник: "Звязда" - 2015-07-30



■ Родныя тапонімы

# КАРСЕКАВА ГАРА

**На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ**

*У кнізе «Памяць. Нясвіжскі раён» упамінаецца Карсекава гара. Ясна, што гэты зямельны надзел звязаны з Карсекам. Буду ўдзячны, калі вы зможаце мне дапамагчы прасачыць, адкуль узяўся гэты Карсека на тэрыторыі ВКЛ?*

**Міхаіл Міхайлавіч КАРСЕКА,**
*Брэсцкая вобласць, Столінскі раён,*
*вёска Калоднае.*

Паважаны Міхаіл Міхайлавіч, прасачыць шлях, адкуль узяўся ўладальнік канкрэтнага зямельнага надзелу, змогуць толькі спецыялісты, якія займаюцца пытаннямі аграрных адносін у часы ВКЛ. Такія спецыялісты, я ўпэўнены, ёсць у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Задача нашай рубрыкі крыху іншая: растлумачыць паходжанне назвы пэўнага геаграфічнага аб'екта. Вы абсалютна правільна адзначаеце, што мясцовае геаграфічнае найменне Карсекава гара з'яўляецца мікратапонімам, яно ўказвае на прозвішча ўладальніка зямельнага надзелу — Карсека. Прозвішча Карсека сустракаецца ў сучаснай іменаслоўнай сістэме беларусаў, але да ліку папулярных яго нельга аднесці. Сем'і з прозвішчам Карсека жывуць толькі ў асобных рэгіёнах Беларусі: у Столінскім раёне Брэсцкай вобласці, Мастоўскім раёне Гродзенскай вобласці, Капыльскім, Нясвіжскім, Стаўбцоўскім і Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці. Не было шырока распаўсюджана гэтае прозвішча і ў старажытнасці (у XIV — XVIII стст.). Даследаванні, праведзеныя беларускімі вучонымі ў галіне антрапанімії Гродзеншчыны і Брэстчыны перыяду ВКЛ (працы Г.К. Усціновіч), Магілёўшчыны і Віцебшчыны (працы В.М. Ляшкевіч), а таксама шматлікія навуковыя публікацыі акадэміка М.В. Бірылы паказалі, што ні імя-мянушка Карсека, ні аднайменнае прозвішча не зафіксавана ў старабеларускіх дзелавых помніках гэтага перыяду. Паказальна, што і ў складзе назваў населеных пунктаў той пары, паводле звестак «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», не засведчана ніводнай назвы з асновай Карсека. Існуе версія, што прозвішча Карсека вядзе сваё паходжанне ад імя-мянушкі Карсак (варыянт Корсак), якое мае цюркскае паходжанне: у кіргізскай і татарскай мовах гэта слова азначае «стэпавая ліса». Акрамя таго, карсакамі татары называлі нізкарослых людзей. У такім разе можна дапусціць, што слова «карсак», адпаведна, імя-мянушка Карсак і яго фанетыка-граматычны варыянт Карсека з'явіліся на тэрыторыі Беларусі са з'яўленнем татар, першыя звесткі пра якіх адносяцца да пачатку XIV стагоддзя. Вялікія князі ВКЛ Гедымін, Кейстут, Альгерд запрашалі татар з Залатой Арды для ўдзелу ў барацьбе з Тэўтонскім ордэнам. Але найбольшая колькасць татар з'явілася ў ВКЛ (каля Вільні, на тэрыторыі Лідскага, Ашмянскага, Навагародскага і Берасцейскага паветаў) у выніку сумеснага паходу Вітаўта і Тахтамыша пад Азоў (1397 год) і Крым (1398). Па сведчанні гістарычных крыніц, татары ў XVI—XVII стст. у ВКЛ валодалі зямельнымі надзеламі: нашчадкі простых воінаў атрымлівалі невялікія ўчасткі зямлі, больш бедным з іх, так званым «ясачным людзям», у гарадах і мястэчках адводзілася зямля пад сядзібы і агароды. Такім чынам, можна дапусціць, што ўладальнікам Карсекавай гары быў менавіта адзін з прадстаўнікоў нашчадкаў татарскіх воінаў. На першы погляд, можа ўзнікнуць пытанне, адкуль на раўніннай і балоцістай тэрыторыі Беларусі маглі быць горы. Справа ў тым, што нашы продкі гарой маглі назваць любое ўзвышанае месца. На Століншчыне ў мясцовых гаворках гарой яшчэ называюць пясчанае неўрадлівае поле.

***Дасылайце свае «тапанімічныя» пытанні на паштовы адрас рэдакцыі або на e-mail: nina@zviazda.by***

Ігар Капылоў. Карсекава гара